*У. П. Скараходаў (Мінск),*
*рэктар Беларускага дзяржаўнага*
*інстытута праблем культуры,*
*заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філасофскіх навук, прафесар*

# МАСТАЦКА-ЭСТЭТЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўка кадраў для культуры і мастацтва надзвычай важны вектар дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання і ўсіх зацікаўленых у гэтай справе. Таму распрацоўка канцэпцыі мастацкай адукацыі, з аднаго боку, заключаецца ў адмаўленні ад каманднa-адміністрацыйных метадаў і пераходзе да прынцыпаў большай самастойнасці, самакіравання і адказнасці навучальных устаноў. Кожная вышэйшая навучальная ўстанова, вучылішча, школа павінны мець права індывідуальнага развіцця з улікам асаблівасцей талентаў сваіх выкладчыкаў. З другога боку, фактычнае замацаванне за беларускай мовай статусу дзяржаўнай ставіць перад навучальнымі ўстановамі ў якасці першачарговых і важных праблемы насычэння навучальнага працэсу нацыянальным зместам, актыўнага выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны народа, грунтоўнага перагляду псеўданавуковых падыходаў да яе, пераадолення моўнай і культурнай інтэрферэнцыі. І, нарэшце, вельмі набалелая праблема — слабая матэрыяльна-тэхнічная база навучальных устаноў. Да прыкладу, сёння ў установе адукацыі — Беларускай акадэміі мастацтваў — на аднаго студэнта прыходзіцца ўсяго 10,5 кв.м вучэбнай плошчы, што ў два з паловай разы менш за існуючыя нарматывы, а забяспечанасць месцамі ў інтэрнаце складае толькі 50 працэнтаў. У гэтай сувязі паўстае адзіная задача — у бліжэйшыя гады стварыць нармальныя ўмовы работы для прафесараў і студэнтаў, настаўнікаў і вучняў, вырашыць праблемы тэхнічнага пераабсталявання, што з'явіцца грунтоўным падмуркам далейшага развіцця культуры, у тым ліку і мастацка-эстэтычнай адукацыі.

У сувязі з гэтым існуючую ў нас сістэму фінансавання мэтазгодна дапоўніць іншымі крыніцамі: школу трэба зрабіць адкрытай для прыватнай падтрымкі, поруч з дзяржаўнымі адчыняць іншага кшталту навучальныя ўстановы мастацтваў і культуры. Выпускнікі навучальных устаноў павінны, у першую чаргу дасканала ведаць нацыянальную культуру, гісторыю беларускага народа, быць адукаванымі спецыялістамі з шырокім гуманітарным светапоглядам, гато-

вымі прафесійна і мэтанакіравана аднаўляць і развіваць культуру і мастацтва Беларусі. Неабходна захаваць дзяржаўную падтрымку, адначасова не адмаўляючыся і ад мэтавага фінансавання дабрачыннымі таварыствамі, фондамі і інш.

Перагляд адміністрацыйных, эканамічных і юрыдычных норм кіравання культурай павінен прывесці да змен у самой сістэме адукацыі. Да прыкладу, індывідуалізацыя навучальных устаноў і вызваленне творчай ініцыятывы настаўніка поўнасцю змяняюць статус планаў і праграм: яны набываюць не дырэктыўны, а рэкамендацыйны характар. Па кожнай дысцыпліне мэтазгодна стварыць пакет праграм, якія б абагульнялі вопыт вядучых выкладчыкаў. Неабходны самы шырокі міжнародны абмен вопытам паміж рознымі навучальнымі ўстановамі.

Адчувальна яшчэ адна сур'ёзная праблема, якая перашкаджае далучэнню да мастацкай дзейнасці самых шырокіх пластоў насельніцтва. Так, назіраецца размежаванне паміж трыма ўзроўнямі культуры — сельскай, гарадской і элітарнай. У выніку ў значнай ступені парушана пераемнасць мастацкага развіцця. Аднак сённяшняе абуджэнне самасвядомасці народа вызначыла многія цікавыя падыходы да масавага мастацкага выхавання. Існуюць і падтрымліваюцца ў рэгіёнах фальклорныя традыцыі ў вуснай форме бытавання; дэкаратыўна-прыкладная, інструментальная і танцавальная народная творчасць і зараз здольная ахапіць значную колькасць людзей розных узроставых груп, напоўніць глыбокім мастацкім зместам штодзённае жыццё як дзіцяці, так і дарослага чалавека. Таму ўвядзенне ў навучальныя планы менавіта рэгіянальных фальклорных традыцый адыгрывае становучую ролю ў аднаўленні жыццётрывалай сістэмы мастацкай адукацыі.

Сістэма мастацка-эстэтычнай адукацыі прадугледжвае наяўнасць дзвюх узаемазвязаных падсістэм: масавага мастацка-эстэтычнага выхавання і прафесійнага навучання. Першае ажыццяўляецца на ўроках у дзіцячым садку, агульнаадукацыйнай школе, часткова ў школах мастацтваў, у сярэдніх спецыяльных навучальных установах, немастацкіх ВНУ. Другое — у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі (школы мастацтваў, вучылішчы, спецыяльныя каледжы і ліцэі, вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва).

Сёння гэтыя дзве падсістэмы ўзаемадзейнічаюць недастаткова, хоць мастацкае навучанне павінна арыентавацца не толькі на падрыхтоўку прафесійных кадраў, але і на сістэму масава-эстэтычнага выхавання. Узнікаючыя непаразуменні выклікаюць страты як у прафесійным, так і ў агульнамастацкім выхаванні. Бо ў канчатковым выніку мастацкае выхаванне і навучанне, незалежна ад умоў функцыянавання, маюць адзіную агульную мэту — далучэнне да духоўнай, стваральнай дзейнасці ўсіх членаў нашага грамадства. Таму абмежаваная арыентацыя, напрыклад, толькі на падрыхтоўку прафесійных кадраў для спецыяльных навучальных устаноў культуры і мастацтваў часта не прыводзіць да пэўна вызначанай спецыялізацыі ў той ці іншай галіне мастацтва. У сваю чаргу, так званае масавае мастацкае выхаванне з прычыны занадта агульных падыходаў да гэтай найважнейшай праблемы не спрыяе выяўленню таленавітых дзяцей і падлеткаў, не стварае ім неабходных умоў для сапраўднага прафесійнага росту. Прафілізацыя, вядома, патрэбна. Але жорсткі адрыў агульна-мастацкага ад спецыяльна-прафесійнага шкодны — ён ужо прывёў да страты агульных прынцыпаў мастацкага станаўлення асобы. Адсюль — і забыццё асвет-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ніцкіх (у лепшым сэнсе гэтага слова) традыцый мастацкай адукацыі на Беларусі, і страта многіх цікавых методык мастацкага выхавання.

Рэспубліка недастаткова атрымлівае кваліфікаваных работнікаў культуры і мастацтва, якія былі б падрыхтаваныя да таго, каб закласці добры падмурак у мастацка-эстэтычнае выхаванне дзяцей у яслях, дзіцячых садках, агульнаадукацыйных школах. Такім чынам, не вырашаецца праблема суадносін агульнага і спецыяльнага навучання, праблема спецыялізацыі, асаблiва педагагічнай накіраванасці.

На падставе ўсяго, што сказана вышэй, неабходна перагледзець усю структуру мастацка-эстэтычнай адукацыі як адзінага механізма, а таксама яго навукова-метадычнае забеспячэнне.

З улікам нацыянальных традыцый, уласцівых ім форм выхавання і навучання, а таксама сусветнай практыкі мэтазгодна вылучыць наступныя асноўныя структурныя напрамкі:

— мастацка-эстэтычнае выхаванне ў дзіцячых яслях і садках;

— урокі музыкі, жывапісу, харэаграфіі і інш. У сярэдняй агульнаадукацыйнай школе не менш дзвюх гадзін на тыдзень з першага па адзінаццаты клас, а таксама факультатыўныя і індывідуальныя заняткі;

— практычная мастацка-выканаўчая дзейнасць навучэнцаў і студэнтаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў на ўзроўні спецыяльнага мастацкага аддзялення ці факультэта;

— спецыяльныя школы і ліцэі мастацтваў;

— сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы мастацтва і культуры, каледжы;

— вышэйшыя навучальныя ўстановы (Акадэмія музыкі, Акадэмія нацыянальнага мастацтва, Акадэмія культуры).

Спецыяльныя школы і ліцэі павінны стаць пачатковым звяном і асновай прафесійнага навучання, а таксама выконваць агульнамастацкія функцыі, галоўная з якіх заключаецца ў тым, каб дапамагчы навучэнцу выявіць свае здольнасці, зрабіць адпаведны выбар. Трэба, каб не толькі дзяржава, але і грамадства праявілі ў гэтым максімальны клопат аб выяўленні і падтрымцы маладых талентаў. На гэтым узроўні павінна быць больш свабоды ў выкарыстанні сродкаў навучання, планаў, праграм. Усе навацыі неабходна ўводзіць у формах, якія дыктуюцца рэальнымі магчымасцямі і падмацаваны матэрыяльнай базай.

Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы мастацтваў і культуры (каледжы) падчас сваёй работы абавязаны набываць прафесійны характар. Тут жа пачынаецца размежаванне функцый падрыхтоўкі для ўстаноў мастацтва і для масавай сферы.

У акадэміях і універсітэтах — з павышэннем ўзроўню кваліфікацыі — з'явяцца шырыня і шматграннасць, якія не будуць супярэчыць глыбіні і фундаментальнасці адукацыі. Такі тып спецыяліста мусіць быць асноўным для ВНУ. Разам з тым шматграннасць задач культуры дыктуе неабходнасць вызначэння дадатковых спецыялізацый (некаторыя з іх магчымыя ўжо на сярэднім узроўні навучання). Падрыхтоўка спецыяліста, выбар ім пэўных спецыялізацый могуць ажыццяўляцца на дагаворных пачатках з зацікаўленымі арганізацыямі і ўстановамі, якія гарантуюць працаўладкаванне.

* * *

Узмацненне інтэграцыі адукацыі, вытворчасці і навукі, новыя эканамічныя ўмовы жыцця ўстаноў культуры, развіццё дэмакратычных працэсаў у грамадстве — усё гэта па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трабуе новых падыходаў да арганізацыі і зместу адукацыйнага працэсу, прафесійных і культурных якасцей кожнага работніка сферы культуры. У сувязі з гэтым трэба перагледзець існуючую практыку павышэння кваліфікацыі кадраў, стымуляваць творчы пошук пры вызначэнні як зместу, так і форм, метадаў арганізацыі навучальнага працэсу, у дыферэнцыяцыі падыходаў да навучання розных катэгорый слухачоў.

Нам трэба адмовіцца ад адзінага інфармацыйна-статычнага вучэбнага плана для ўсіх катэгорый навучэнцаў. Планы, праграмы і курсы вучэбных заняткаў павінны арыентавацца як на рэальную практыку, канкрэтныя пытанні і задачы, з якімі судакранаецца спецыяліст, так і на перспектыву развіцця ўсёй сферы культуры.

Сістэма павышэння кваліфікацыі павінна фарміраваць актыўную, адукаваную асобу, здольную мэтанакіравана працаваць у сферы сваёй дзейнасці, забяспечваць прагрэсіўнае развіццё культуры і мастацтва.

Зыходзячы з асноўных прынцыпаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры, можна вылучыць такія асноўныя мэты гэтага віду адукацыі:

— стымуляванне творчага патэнцыялу асобы і стварэнне неабходных умоў для прафесійнага росту;

— навучанне спецыяліста ўменню ўбачыць рэальныя і патэнцыяльныя супярэчнасці ў грамадскім жыцці, асабліва ў сферы культуры і мастацтва, фарміраванне навыкаў арыентацыі ў зменлівай сацыякультурнай сітуацыі;

— прадастаўленне магчымасці самаадукацыі;

— планаванне і арганізацыя на ўзроўні дзяржаўнай кадравай палітыкі змены пакаленняў кіраўнікоў у сферы культуры і мастацтва, фарміраванне новых спецыяльнасцей і спецыялізацый;

— гарманізацыя індывідуальных і грамадскіх патрэб пры павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы спецыялістаў;

— распрацоўка неабходнага інфармацыйнага забеспячэння сістэмы павышэння кваліфікацыі з шырокім выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі, самых новых сродкаў інфармацыі;

— распрацоўка адпаведных мадэляў навукова-метадычнага забеспячэння сістэмы павышэння кваліфікацыі кадраў;

— правядзенне сацыялагічных даследаванняў, накіраваных на выяўленне патрэб у павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў культуры розных катэгорый;

— пераход у арганізацыі навучання ад стэрэатыпнай, універсальнай да модульнай, варыятыўнай пабудовы навучальных курсаў.

Поспех тут будзе залежаць ад узроўню саміх работнікаў сістэмы павышэння кваліфікацыі. Яны павінны валодаць грунтоўнымі ведамі, практычным вопытам, быць спецыялістамі ў галіне культуры, добра арыентавацца ў разнастайных плынях навуковай інфармацыі, адукацыйных навацыях, праблемах эканамічнага, сацыяльнага і духоўнага жыцця грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ